# ВОДЗЫЎ

**на аўтарэферат дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўны "Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)"**, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09–гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Актуальнасць вывучэння аграрнай гісторыі на сучасным этапе развіцця Рэспублікі Беларусь абумоўлена прыярытэтнасцю напрамкаў унутранай палітыкі, якімі выступаюць эканамічнае, сацыяльнае і культурнае адраджэнне рэгіёнаў і беларускай вёскі. Грунтоўны аналіз гістарычнага вопыту рэформ у аграрным сектары і гістарыяграфічнае асэнсаванне развіцця сельскай гаспадаркі на беларускіх землях у перыяд станаўлення капіталістычных адносін дазвалае выявіць прабелы і тэарэтычныя скажэнні, выкліканыя суб'ектыўнымі ацэнкамі. У гэтай сувязі даследаванне Н.К.Сямашка з'яўляецца актуальным і валодае значнай навуковай навізной.

Дысертацыя "Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)", прадстаўленая на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання, складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса. Дадзеная структура работы адпавядае мэце і задачам навуковага даследавання, яе змест адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.

У рабоце даследчыкам выкарыстаны шырокі набор метадаў для вывучэння праблемы, аргументавана паказана канцэптуальная ідэя дысертацыі. Нягледзячы на значную ўвагу савецкіх і беларускіх гісторыкаў да аграрнай гісторыі канца XVIII – першай паловы XIX ст., працы змяшчаюць суб'ектыўныя высновы, што тлумачыцца ідэалагічнымі ўстаноўкамі часу іх напісання. Таму распрацоўка тэмы дысертацыі дазволіла выявіць прабелы, абгрунтаваць перыядызацыю вывучэння праблемы і акрэсліць новыя падыходы да яе вывучэння. Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, лагічна адлюстроўваюць вынікі дысертацыйнага даследавання, вызначаюцца навізной і актуальнасцю.

Саіскальнікам прааналізаваны працы даследчыкаў дарэвалюцыйнага перыяду, выяўлены напрамкі і прыярытэты навуковых пошукаў савецкага часу, упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзены аналіз сучаснага стану вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – 1850-х гг. Аўтарам устаноўлена, што для даследчыкаў перыяду сярэдзіны XIX – пачатку XX ст. характэрны апісальны падыход і этнаграфічны характар прац, зменшана роля сацыяльна-эканамічнага фактару ў жыцці грамадства.

Публікацыі савецкага перыяду характарызуюцца комплексным і грунтоўным падыходам з апорай на шырокае кола крыніц пры панаванні марксісцка-ленінскай метадалогіі, што абумовіла перабольшванне тэмпаў развіцця элементаў капіталізму і перанос агульнарасійскіх характарыстык развіцця аграрнага сектара эканомікі на нацыянальную глебу.

Аналіз даследаванняў сучаснага перыяду дазволіў дысертанту вылучыць новыя тэндэнцыі ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – 1850-х гг., што знайшло сваё адлюстраванне ў прымяненні тэорыі мадэрнізацыі, выкарыстанні метадаў мікрагісторыі і гісторыі паўсядзённасці, гендэрнага і сацыяльнага аспектаў у навуковых пошуках. Абгрунтаванасць высноў, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечаны выкарыстаннем значнай колькасці навуковых крыніц.

Вынікі навуковага даследавання адлюстраваны ў 16-ці публікацыях агульным аб'ёмам 4,4 друкаваных аркушаў, а таксама прайшлі апрабацыю на навуковых канферэнцыях. Дысертацыйнае даследаванне заслугоўвае станоўчую ацэнку з пункту гледжання яго практычнай значнасці, вынікі якога могуць быць выкарыстаны ў адукацыйным працэсе, пры падрыхтоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, а таксама пры напісанні абагульняючых прац па гістарыяграфіі аграрнай гісторыі.

У аўтарэфераце адлюстраваны асноўны змест дысертацыі, яе структура, вынікі даследавання і палажэнні, якія выносцца на абарону. Аўтарэферат у цэлым адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Змест аўтарэферата сведчыць аб тым, што Сямашка Надзеі Канстанцінаўне можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Начальнік упраўлення адукацыі,
навукі і культуры галоўнага ўпраўлення
развіцця сацыяльнай сферы
Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.У.Канойка

Подпіс А.У.Канойка сведчу.

Начальнік аддзела кіравання персаналам
галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі
Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ю.А.Кашаленка